# ПОЛЕ ДЫКТУЕ РЫТМ ЗАВОДУ

## *Праблемы перапрацоўчай прамысловасці*


**Ц. КІСЯЛЁЎ**

**Старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР**


У ТЭЗІСАХ ЦК КПСС «50 гадоў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі» гаворыцца: «Савецкая эканоміка, якая развіваецца на базе сучаснай навукі і тэхнікі, становіцца ўсё больш збалансаванай і гарманічнай. Захоўваючы апярэджвальныя тэмпы росту цяжкай індустрыі, партыя ўзяла курс на хуткае развіццё тых галін прамысловасці, якія непасрэдна задавальняюць матэрыяльныя і культурныя патрэбнасці насельніцтва, на тэхнічную рэканструкцыю гэтых галін, умацаванне і расшырэнне іх сыравіннай і энергетычнай базы».

Гэты курс знайшоў увасабленне ў вядомых рашэннях і практычнай дзейнасці партыі і ўрада па развіцці сельскай гаспадаркі, хімічнай, лёгкай, харчовай і іншых галін прамысловасці, у прыватнасці ў нядаўна прынятай Цэнтральным Камітэтам КПСС і Саветам Міністраў СССР пастанове «Аб мерах па далейшаму развіццю вытворча-тэхнічнай базы мясной і малочнай прамысловасці».

Калгасы і саўгасы Беларусі значна павялічылі вытворчасць і продаж сельскагаспадарчых прадуктаў. Узраслі зборы збожжа, цукровых буракоў, ільну, узнялася прадуктыўнасць грамадскай жывёлагадоўлі. За два гады вытворчасць мяса і малака павялічылася на 43 працэнты. Насельніцтва рэспублікі адразу ж адчула гэта: яму ж у 1966 годзе было прададзена больш, чым у 1964-м, мяса і мясапрадуктаў на 31 працэнт, малака і малочных прадуктаў — на 38, яек — на 65 працэнтаў.

Аднак задавальняцца дасягнутым мы не маем права. Рэзка павялічылася вытворчасць жывёлагадоўчых прадуктаў, вырасла пакупная здольнасць насельніцтва — гэта, вядома, добра. Але адначасова ўзнікла іншая праблема — неабходнасць рашуча паскорыць развіццё перапрацоўчай прамысловасці.

За гады сямігодкі ў рэспубліцы ўведзена ў дзеянне тры цукровыя заводы, пяць мясакамбінатаў, 26 прадпрыемстваў малочнай прамысловасці, 10 хлебазаводаў. Рэканструяваны некаторыя дзеючыя прадпрыемствы. За гэты час дзяржаўныя капіталаўкладанні на будаўніцтва ў харчовай і мяса-малочнай галінах прамысловасці перавысілі сто мільёнаў рублёў. Вытворчыя асноўныя фонды харчовай прамысловасці павялічыліся ў 1,9 раза. У выніку ўзрасла вытворчасць і расшыран асартымент малочных і мясных вырабаў. У некалькі большых аб'ёмах перапрацоўваюцца агародніна і фрукты.

Высокія тэмпы росту вытворчасці харчовых прадуктаў захаваюцца ў рэспубліцы і на працягу пяцігодкі. Мяркуецца, што гаспадаркі Беларусі ўжо ў сёлетнім годзе прададуць дзяржаве 575 тысяч тон жывёлы і каля 2.200 тысяч тон малака—больш, чым намечана на канец пяцігодкі. У 1968 годзе будзе прададзена жывёлы і птушкі прыкладна 600 тысяч тон і малака не менш 2.250 тысяч тон.

Цяпер рост вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі значна апярэджвае развіццё перапрацоўчай прамысловасці. Некаторыя дзеючыя прадпрыемствы аснашчаны ўстарэлым, малапрадукцыйным абсталяваннем. Недахват магутнасцей не толькі прадпрыемстваў мясной і малочнай прамысловасці, але і заводаў па перапрацоўцы льну, кансерваванню гародніны і фруктаў адмоўна адбіваецца на эканоміцы калгасаў і саўгасаў. Асабліва складана бывае часам здаць жывёлу на мясакамбінат. Адкормленая жывёла перапрымліваецца, адбіваецца падаражанне прадукцыі. Становішча пагаршаецца яшчэ і тым, што рэспубліка не мае дастатковай колькасці халадзільнікаў. Калі доля Беларусі ў вытворчасці мяса і малака ў краіне 6 працэнтаў, то ўдзельная вага магутнасцей халадзільнікаў — толькі 3,6 працэнта. Такая адна з прычын таго, што не поўнасцю задавальняюцца патрэбнасці насельніцтва ў вэнджаннях, сасісках, сардэльках, цэльнамалочнай прадукцыі, некаторых відах сыроў і іншых прадуктаў.

АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ прынятай Цэнтральным Камітэтам КПСС і Саветам Міністраў СССР пастановы прадугледжвае вялікую адказнасць рэспубліканскіх органаў за развіццё вытворча-тэхнічнай базы мясной і малочнай прамысловасці. Між тым, Міністэрства мясной і малочнай прамысловасці БССР, будаўнічыя арганізацыі не выкарыстоўваюць яшчэ ўсіх магчымасцей для своечасовага ўводу ў эксплуатацыю будуемых аб'ектаў. Не ўсё зроблена для таго, каб палепшыць работу дзеючых прадпрыемстваў, расшырыць асартымент выпускаемай прадукцыі.

Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі, Савет Міністраў рэспублікі дабіваюцца ліквідацыі недахопаў, выканання прынятых у гонар 50-годдзя Савецкай улады абавязацельстваў. Але не ўсё, на жаль, залежыць ад мясцовых намаганняў. Міністэрства мясной і малочнай прамысловасці СССР нясвоечасова забяспечвае некаторыя будоўлі бягучага года праектнай дакументацыяй і абсталяваннем. Не поўнасцю вырашаюцца пытанні праектавання і фінансавання праектных работ на будучае. Прадугледжваемы міністэрствам увод магутнасцей у гады пяцігодкі, што засталіся, не задавальняе нашых патрэбнасцей у перапрацоўцы жывёлагадоўчых прадуктаў.

Істотную дапамогу дзяржаўнай прамысловасці маглі б аказаць перапрацоўчыя прадпрыемствы спажывецкай кааперацыі. На жаль, тэмпы іх развіцця не могуць быць прызнаны здавальняючымі. Кааперацыя мае невялікія цэхі, асартымент прадукцыі якіх абмежаван двума-трыма вырабамі. Намячаемы Белкаапсаюзам у бягучым пяцігоддзі ўвод новых прадпрыемстваў дасць невялікі прырост магутнасцей па выпрацоўцы каўбасных вырабаў і вэнджанняў. Але ўзвядзенне гэтых прадпрыемстваў стрымліваецца і недахватам крэдытаў, якія выдзяляе Будбанк, і тым, што адпушчаныя банкам пазыкі не забяспечваюцца будаўнічымі матэрыяламі, абсталяваннем.

НАКОПЛЕН у рэспубліцы некаторы станоўчы вопыт арганізацыі прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны ў калгасах і саўгасах. Яны хутка сябе акупляюць і прыносяць значны прыбытак.

У саўгасе «Любань» Вілейскага раёна пабудаваны і працуюць кансервавы і вінаробчы цэхі. Прадпрыемствы выпускаюць 15 відаў фруктовых і гароднінных кансерваў, 12 марак пладова-ягадных він. Прадукцыя саўгаса атрымала прызнанне і карыстаецца добрым попытам у спажыўца. У 1966 годзе саўгас атрымаў ад прамысловай перапрацоўкі сельскагаспадарчай сыравіны 200 тысяч рублёў прыбытку. Падлікі паказваюць, што без кансервавай вытворчасці кожная тона гародніны ў гэтым саўгасе дае ў сярэднім прыбытку 111 рублёў, а ў перапрацаваным выглядзе 146 рублёў. Лёгка ўявіць, які прыбытак могуць атрымаць саўгасы і калгасы рэспублікі ад прамысловай перапрацоўкі гародніны і фруктаў. Трэба заўважыць, што гэтыя прадпрыемствы самым спрыяльным чынам робяць уплыў на развіццё іншых галін сельскагаспадарчай вытворчасці. Істотны ўплыў аказвае, напрыклад, выкарыстанне адходаў саўгасных спіртзаводаў на вытворчасць прадукцыі жывёлагадоўлі.

На жаль, развіццё падсобных прадпрыемстваў у калгасах і саўгасах стрымліваецца недахватам абсталявання. Натуральна, мы ўяўляем сабе, што далёка не ў кожнай гаспадарцы мэтазгодна арганізацыя такіх прадпрыемстваў. Тут магчымая і, на нашу думку, разумная кааперацыя некалькіх гаспадарак. Важнай умовай стварэння на вёсцы перапрацоўчых прадпрыемстваў з'яўляецца таксама наяўнасць добрых тыпавых праектаў агародніна- і фруктаперапрацоўчых, малочных і сыраробчых цэхаў, узвядзенне якіх не патрабавала б вялікіх сродкаў. Адпаведныя міністэрствы і ведамствы павінны ўважліва разгледзець гэтыя пытанні і знайсці шляхі іх вырашэння.

ХОЧАЦЦА спыніцца яшчэ на адной вельмі важнай для нас праблеме—пярвічнай апрацоўцы льну. Калгасы і саўгасы рэспублікі з кожным годам павышаюць ураджайнасць гэтай культуры. Нарыхтоўкі льновалакна ўзраслі з 55,6 тысячы тон у 1959 годзе да 100 тысяч тон у 1966 годзе.

У той жа час рост вытворчых магутнасцей пярвічнай апрацоўкі льну значна адстае. Прамысловасць рэспублікі ў стане перапрацаваць толькі 70 працэнтаў валавога збору льну. Большасць заводаў перагружана сыравінай, працяглае захоўванне якой пад адкрытым небам прыводзіць да вялікіх страт і зніжэння якасці валакна. Каб забяспечыць заводскую перапрацоўку вырошчваемага ў калгасах і саўгасах ільну, нам неабходна пабудаваць дадаткова не менш дваццаці льнозаводаў.

Недахват прамысловых магутнасцей можна было б у нейкай меры часова кампенсаваць, павялічыўшы пярвічную перапрацоўку льну непасрэдна ў гаспадарках. Для гэтага неабходна забяспечыць іх ільноперапрацоўчымі агрэгатамі «ТЛ-40», якія, на жаль, на працягу ўжо некалькіх гадоў не пастаўляюцца.

Патрабуе значнага паляпшэння арганізацыя матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння льнозаводаў запаснымі часткамі для рамонту. Неабходна таксама прыняць меры для скарачэння тэрмінаў і паляпшэння якасці іх праектавання. Цэнтральнаму навукова-даследчаму інстытуту лубяных валокнаў Міністэрства лёгкай прамысловасці СССР і Усесаюзнаму навукова-даследчаму інстытугу льну Міністэрства сельскай гаспадаркі Саюза трэба больш настойліва вырашаць наспеўшыя пытанні ўдасканальвання тэхналогіі заводскай перапрацоўкі льну.

Больш хуткае развіццё перапрацоўчай прамысловасці — загад часу. Ад гэтага ў многім залежаць далейшы ўздым сельскай гаспадаркі, найбольш поўнае задавальненне ўзросшых патрэбнасцей працоўных у разнастайных і высакаякасных прадуктовых і прамысловых таварах.

**(«Известия» за 13 жніўня 1967 г.).**